# Новы напрамак інвеставання-ERG-прынцыпы

***У. А. Майсяенак***
*м. э. н, ст. выкладчык, аспірант,*
*УА Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці, г. Мінск, Беларусь,*
*e-mail: oksana.moyseenok@inbox.ru,*
*ORCID: 0000-0001-7448-3250*

ESG-прынцыпы былі ўпершыню сфармуляваны сакратаром ААН Кофі Ананам, які прапанаваў кіраўнікам значных міжнародных канцэрнаў ўключыць іх у свае бізнес-стратэгіі, перш за ўсё для барацьбы з глабальным пацяпленнем.

ESG-гэта своеасаблівы збор правілаў і падыходаў, якія павінны ўлічваць улады і бізнесмены, распрацоўваючы планы развіцця, разглядаючы пытанні абароны навакольнага асяроддзя, адносіны з супрацоўнікамі, кліентамі, грамадствам, а таксама стандарты стратэгічнага кіравання.

Ва ўсім свеце склаўся сур'ёзны трэнд росту адказнага інвеставання. Інвестары хочуць супрацоўнічаць з прадпрыемствамі, якія думаюць не толькі аб максімізацыі прыбытку, але і берагуць экалогію і сваіх працоўнікаў, нецярпіма ставяцца да карупцыі, расавай і гендэрнай дыскрымінацыі.

Эксперты сцвярджаюць, што найбольшую цікавасць да ESG-інвестыцый праяўляюць людзі, якія нарадзіліся ў канцы ХХ стагоддзя. Міленіялы лічаць, што такі падыход дапаможа ім змагацца са змяненнем клімату на планеце, сацыяльнай няроўнасцю ў грамадстве, ушчамленнем правоў і свабод.

Змены ў навакольным асяроддзі, сітуацыя з COVID-19, імкненне да адказнага кіравання і вядзення бізнесу з улікам экалагічных і сацыяльных наступстваў зменіць кіраўніцтва кампаніямі і сфарміруе ўліванне інвестыцый у зялёную эканоміку. Вельмі хутка міжнародныя карпарацыі спыняць накіроўваць грашовыя патокі ў кампаніі, якія ігнаруюць прынцыпы ўстойлівага развіцця. Расце колькасць інвестараў, зацікаўленых у адпаведнасці крытэрам ESG (Табліца 1). Такім чынам, яны аказваюць уплыў на каціроўкі арганізацый.

**Табліца 1**

**Разуменне новых падыходаў сярод Інвест-кампаній**

| Памер актываў | Ведаюць пра магчымасці ESG-інвеставання | Схільныя да ўкладанняў у ESG-фонд |
|---|---|---|
| 100 тыс -150 тыс дал ЗША | 41 % | 43 % |
| 150 тыс -250 тыс дал ЗША США | 43 % | 40 % |
| 250 тыс -500 тыс дал ЗША | 31 % | 41 % |
| 500 тыс -1 000 тыс дал ЗША | 34 % | 37 % |
| Ад 1 млн дал ЗША | 42 % | 29 % |

Заўвага. Крыніца-[https://advisor.visualcapitalist.com/the-rise-of-the-values-driven-investor/].

Самы распаўсюджаны спосаб інвеставання ў дадзеным кірунку-выкарыстоўваць ESG-фонды. Яны інвестуюць у арганізацыі з высокімі паказчыкамі ESG. Адзінай сферы укладанняў не існуе-яны вельмі розныя. У першай палове 2020 года, па дадзеных кампаніі Morningstar, былі адкрыты 23 новых ESG-фонду. Яшчэ столькі ж плануецца адкрыць. Bloomberg падлічыў, што ў 2020 годзе інвестыцыі ў ESG-фонды ўжо ў 3 разы перавысілі аб'ёмы 2019 года. І ў наступным працэс будзе толькі паскарацца. Краіны Еўропы і Амерыкі ўводзяць загараджальныя крытэрыі, якія абмяжуюць прыток інвестыцый у «брудныя» прадпрыемствы. Напрыклад, па Парыжскім пагадненні да 2030 года еўрапейскія краіны павінны скараціць выкіды парніковых газаў на 50% ад узроўню 1990 г. У 2023 годзе ЕС уводзіць Вугляродны падатак на імпартныя тавары. Гэта паскорыць пераход на менш шкодныя тэхналогіі. Вынікаючы новаму вектару ў інвеставанні, сусветны фондавы рынак павышае цэны на акцыі ESG-кампаній і ставарае новыя біржавыя фонды [1].

У Беларусі БПС-Ашчадбанк стаў адной з першых арганізацый, якая цалкам перайшла на прынцыпы ESG-устойлівага развіцця з клопатам аб прыродзе. У банку скарачаюць выдаткі паперы, праводзяць высадку дрэў. Кіраўніцтва банка заяўляе, што ў будучыні «зялёнымі» стануць іх крэдыты і закупкі.

Для ўстойлівага развіцця важна, каб людзі спажывалі прадукты і паслугі свядомым, рацыянальным чынам. Для гэтага павінны выкарыстоўвацца высокаэфектыўныя, прадукцыйныя тавары, якія адказваюць інтарэсам кліентаў, і якія павінны быць створаны з дапамогай экалагічных тэхналогій. Неабходна аб'яднаць намаганні і ў рамках галіны і з іншымі галінамі.

**Ключовi слова:** новы напрамак; erg-прынцыпы; інвеставання.

## Список використаних джерел

*1 Што такое ESG-інвеставанне [Электронны рэсурс]-https://life.akbars.ru/pf/ESG-principy-v-investirovanii -Дата доступу*